АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ.

1.1. Грамадскае аб'яднанне "Беларускі саюз музычных дзеячаў" (далей па тэксту Статута – БСМД) – творчы саюз, які аб'ядноўвае на падставе прынцыпаў законнасці і дабраахвотнасці, дэмакратычных пачатках самакіравання і галоснасці дзеячаў музычнага, харэаграфічнага і эстраднага мастацтва.

1.2. БСМД – грамадская творчая арганізацыя, якая мае поўную арганізацыйную і вытворча-творчую самастойнасць, у сваёй дзейнасці кіруецца дзеючай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", Законам Рэспублікі Беларусь "Аб творчых саюзах і творчых работніках", Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, дзеючым заканадаўствам і гэтым Статутам.

1.3. Поўная назва:

на беларускай мове: Грамадскае аб'яднанне "Беларускі саюз музычных дзеячаў";

на рускай мове: Общественное объединение "Белорусский союз музыкальных деятелей".

Скарочаная назва:

на беларускай мове: ГА "БСМД";

на рускай мове: ОО "БСМД".

1.4. БСМД можа ўзаемадзейнічаць з дзяржаўнымі ўстановамі і арганізацыямі, грамадскімі арганізацыямі грамадзян Беларусі і іншых краін.

1.5. БСМД мае статус рэспубліканскага аб'яднання і дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа ўступаць у міжнародныя няўрадавыя арганізацыі, падтрымліваць непасрэдныя міжнародныя кантакты і сувязі, заключаць адпаведныя пагадненні, удзельнічаць у

ажыццяўленні мерапрыемстваў, якія не супярэчаць міжнародным абавязацельствам Рэспублікі Беларусь.

1.6. Забараняецца дзейнасць БСМД у мэтах гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу, прапаганды вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці, ажыццяўлення тэрарыстычнай і іншай экстрэмісцкай дзейнасці, іншых дзеянняў, забароненых заканадаўствам.

1.7. Сімволіка (сцяг, гімн, эмблема, значок, вымпел, гальштук, нагрудныя і апазнавальныя знакі) БСМД не павінна служыць мэтам ажыццяўлення прапаганды вайны, тэрарыстычнай і іншай экстрэмісцкай дзейнасці, іншых дзеянняў, забароненых заканадаўствам.

1.8. БСМД абавязана выконваць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, Закон Рэспублікі Беларусь “Аб грамадскіх аб’яднаннях”, Закон Рэспублікі Беларусь “Аб творчых саюзах і творчых работніках”, Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, іншыя акты заканадаўства, гэты Статут, забяспечваць выкананне асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі, канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, якія зацвярджаюцца Усебеларускім народным сходам.

1.9. БСМД з’яўляецца юрыдычнай асобай, мае рахункі ў банках у рублях і валюце, пячатку, штамп, сімволіку, зарэгістраваныя ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

1.10. Юрыдычны адрас ГА “БСМД”:
220030, г. Мінск, вул. Я.Купалы, 17/30.

## 2. МЭТЫ, ЗАДАЧЫ І МЕТАДЫ ДЗЕЙНАСЦІ.

2.1. Мэты БСМД:

– удзел у захаванні і развіцці беларускай нацыянальнай культуры, садзейнічанне ў стварэнні, распаўсюджванні, папулярызацыі твораў музычнага, харэаграфічнага і эстраднага мастацтва;
– узбагачэнне культурнага жыцця, далучэнне грамадзян Рэспублікі Беларусь да культурных каштоўнасцей сусветнай культуры;
– развіццё творчага патэнцыялу і творчай ініцыятывы ў сферы культуры, мастацкага густу грамадзян, іх маральнае і эстэтычнае выхаванне, падтрымка і папулярызацыя ваенна-патрыятычнага, сацыяльнага, дабрачыннага і гуманітарнага напрамкаў у сферы культуры;
– каардынацыя дзяржаўных устаноў і арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў і грамадзян у вырашэнні праблем развіцця нацыянальнай культуры і мастацтва;
– рэалізацыя творчых здольнасцей творчых работнікаў, ажыццяўленне сумеснай творчай дзейнасці;
– заахвочванне наватарства, павышэння прафесійнага майстэрства і культуры духоўных адносін;
– падтрымка членаў БСМД, удзел у абароне іх прафесійных правоў.

2.2. Задачы БСМД:

– прапаганда музычнага выканаўчага мастацтва ў Беларусі і іншых краінах;
– арганізацыя ўзаемадзеяння прафесійных дзеячаў музычнага, харэаграфічнага і эстраднага мастацтва;
– аказанне дапамогі членам БСМД у выяўленні і рэалізацыі творчага патэнцыялу, садзейнічанне прафесійнаму станаўленню творчай моладзі, навучанню і стажыроўцы яе ў вядучых майстроў Беларусі і іншых краін;

- ажыццяўленне асветніцкай і дабрачыннай дзейнасці;
- інфармаванне членаў БСМД, шырокай грамадскасці пра падзеі ў музычным, харэаграфічным і эстрадным мастацтве з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі;
- забеспячэнне правоў творчай асобы на свабоду мастацкага самавыяўлення;
- садзеянне ў стварэнні належных сацыяльна-бытавых умоў членам БСМД.

2.3. У адпаведнасці з галоўнымі мэтамі і задачамі БСМД:

- спрыяе ўстанаўленню творчых кантактаў, абмену прафесійнымі ведамі і майстэрствам паміж членамі БСМД;
- стварае і засноўвае творчыя калектывы, прадпрыемствы, малыя і сумесныя прадпрыемствы, майстэрні і іншыя гасразліковыя арганізацыі і структурныя падраздзяленні;
- здзяйсненне прадпрымальніцкай дзейнасці пры неабходнасці для рэалізацыі статутных мэтаў у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, пры дапамозе ўтварэння камерцыйных стварэнняў і (ці) удзелу ў іх;
- стварае ўласныя і карыстуецца ва ўстаноўленным парадку дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі, атрымлівае і распаўсюджвае інфармацыю, якая мае дачыненне да статутнай дзейнасці;
- садзейнічае міжнароднаму абмену спецыялістамі і навучэнцамі;
- прадстаўляе ва ўстаноўленным законам парадку кандыдатаў з членаў БСМД для прысуджэння прэмій, узнагарод і ганаровых званняў дзеячаў культуры і мастацтва;
- арганізуе павышэнне кваліфікацыі і прафесійнага майстэрства членаў БСМД;

- распрацоўвае рэкамендацыі па паляпшэнні ўмоў дзейнасці творчых калектываў, арганізацый, устаноў і прапановы па развіццю дзяржаўнай культурнай палітыкі;
- удзельнічае ў распрацоўцы і абмеркаванні праектаў законаў і іншых нарматыўных актаў, якія рэгулююць арганізацыйна-творчыя працэсы ў музычным, харэаграфічным і эстрадным мастацтве;
- прадстаўляе і прымае ўдзел у абароне правоў і законных інтарэсаў сваіх членаў у дзяржаўных, гаспадарчых і грамадскіх органах і арганізацыях;
- каардынуе і забяспечвае творчыя сувязі прафесіяналаў і аматараў мастацтва;
- садзейнічае правядзенню тэматычных выставак, канцэртаў, лекцый; развіццю і папулярызацыі фальклорнага мастацтва, масавых форм і жанраў прафесійнага і аматарскага музычнага, харэаграфічнага і эстраднага мастацтва, арганізацыі і якаснага функцыянавання прафесійных і аматарскіх музычных, харэаграфічных, эстрадных калектываў і асобных выканаўцаў;
- ажыццяўляе ва ўстаноўленным законам парадку гастрольна-канцэртную дзейнасць, арганізуе творчыя конкурсы, фестывалі;
- без стварэння камерцыйных арганізацый і (або) удзелу ў іх рэалізуе адукацыйныя праграмы навучальных курсаў (праблемна-тэматычныя лекторыі, семінары і семінары-практыкумы, творчыя лабараторыі, трэнінгі, майстар-класы, творча-практычныя кансультацыі вядучых дзеячаў культуры і мастацтваў), спрыяе арганізацыі і правядзенню навуковых і навукова-метадычных канферэнцый, сімпозіумаў, экспертыз, творчых паездак па Беларусі і ў іншых краінах з мэтай распаўсюджвання дасягненняў беларускага мастацтва, удзел у распрацоўцы і падтрымліванні эксперыментальных творчых праектаў, мастацкіх праграм па

ўдасканальванню магчымасцей і здольнасцей асобы ў парадку, устаноўленых заканадаўствам аб адукацыі;

- ажыццяўляе дзейнасць па вытворчасці фільмаў і падрыхтоўцы тэлевізійных праграм без стварэння камерцыйных арганізацый і (або) удзелу ў іх;
- садзейнічае працаўладкаванню членаў БСМД па спецыяльнасці і пры страце прафесійнай працаздольнасці;
- адкрывае і ўтрымлівае клубы, бібліятэкі, музеі, санаторыі, дачы, пансіянаты, базы адпачынку, дамы ветэранаў, інтэрнаты, дзіцячыя яслі і сады, лячэбныя ўстановы, прафілакторыі, спартыўна-аздараўленчыя комплексы;
- садзейнічае прадстаўленню сваім членам і іх сем’ям пуцёвак у здраўніцы і дзіцячыя ўстановы;
- аказвае членам БСМД матэрыяльную дапамогу, пастаянна аддае ўвагу ветэранам – членам БСМД;
- развівае творчыя міжнародныя сувязі, удзельнічае ў рабоце міжнародных прафесійных і асветніцкіх арганізацый музычнага, харэаграфічнага і эстраднага мастацтва;
- спрыяе арганізацыі якаснай творчай дзейнасці і культурна-масавых забаў творчымі калектывамі і асобнымі выканаўцамі без стварэння камерцыйных арганізацый і (або) удзелу ў іх;
- ажыццяўляе іншыя функцыі ў адпаведнасці са статутнымі мэтамі і задачамі.

3. ЧЛЕНЫ БСМД. ІХ ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ.

3.1. БСМД мае фіксаванае членства.

3.2. Членамі БСМД могуць быць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, асобы без грамадзянства, замежныя грамадзяне, якія пастаянна пражываюць ці працуюць у Рэспубліцы Беларусь, якія дасягнулі

васемнаццацігадовага ўзросту і з'яўляюцца прафесійнымі дзеячамі музычнага, харэаграфічнага і эстраднага мастацтва, музычнай педагогікі, выхавання і асветніцтва, мастацтвазнаўцы, аматары, творчая дзейнасць якіх атрымала грамадскае прызнанне, майстры музычных інструментаў, менеджэры, работнікі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый культуры і мастацтва, якія прапрацавалі ў гэтай сферы не менш як тры гады.

3.3. Прыём у члены БСМД праводзіцца на чарговым пасяджэнні прэзідыума Праўлення простай большасцю галасоў па асабістай пісьмовай заяве ўступаючага і па рэкамендацыі абласнога або Мінскага гарадскога аддзялення.

3.4. Члены БСМД плацяць уступны ўзнос у памеры адной базавай велічыні і штогодны ўзнос у памеры адной базавай велічыні на дзень унясення ўзносу.

3.5. Члену БСМД уручаецца членскі білет. Неабходныя дадзеныя аб членах БСМД рэгіструюцца ў журналах уліку членаў па кожнай вобласці і па г. Мінску асобна.

3.6. Члены БСМД маюць права:

– выбіраць і быць абранымі ў выбарныя органы БСМД;
– на індывідуальную творчасць і абарону яе вынікаў;
– на садзейнічанне БСМД у працаўладкаванні па спецыяльнасці;
– на садзейнічанне БСМД па ўдзелу ў рэспубліканскіх і міжнародных прафесійных конкурсах, фестывалях, сімпозіумах, майстар-класах;
– удзельнічаць у мерапрыемствах, якія праводзіць БСМД;
– уносіць прапановы ва ўсе органы БСМД па пытаннях яго дзейнасці і прымаць удзел у іх абмеркаванні з правам дарадчага голасу;
– удзельнічаць у абмеркаванні пытанняў, якія звязаны з яго асабістай творчай, асветніцкай і іншай статутнай дзейнасцю;

- карыстацца ўсімі відамі дапамогі, якую прадстаўляе БСМД, паслугамі належачых БСМД установ, арганізацый і прадпрыемстваў;
- выйсці з членаў БСМД.

3.7. Члены БСМД абавязаны:

- выконваць патрабаванні гэтага Статута;
- рэгулярна плаціць узносы;
- прымаць удзел у дзейнасці БСМД.

3.8. Страта членства ў БСМД адбываецца ў выпадку невыканання членам БСМД палажэнняў гэтага Статута.

3.8.1. За няплату членскіх узносаў на працягу двух гадоў член БСМД можа быць выключаны.

3.9. За невыкананне патрабаванняў Статута, учынкі, якія дыскрэдытуюць БСМД, неплату членскіх узносаў на працягу двух гадоў член БСМД можа быць выключаны.

3.10. Пытанне аб выключэнні з членаў БСМД разглядаецца прэзідыумам Праўлення з абмеркаваннем рэкамендацыі абласных або Мінскага гарадскога аддзяленняў. Рашэнне прымаецца не менш як 2/3 абранага саставу прэзідыума Праўлення БСМД. Яно можа быць на працягу месяца абскарджана ў Праўленне БСМД. Рашэнне Праўлення канчатковае.

3.11. Выключаны з членаў БСМД можа быць зноў прыняты на агульнай падставе праз год з моманту прыняцця рашэння аб выключэнні.

3.12. За актыўны ўдзел у дзейнасці БСМД і значны ўклад у развіццё культуры і мастацтва Беларусі члены БСМД могуць заахвочвацца маральна і матэрыяльна.

4. СТРУКТУРА І ВЫБАРНЫЯ ОРГАНЫ БСМД.

4.1. БСМД будуецца па тэрытарыяльнаму, вытворчаму або прафесійнаму прынцыпу.

4.2. Структуру БСМД складаюць абласныя (Брэсцкае, Віцебскае, Гомельскае, Гродненскае, Магілёўскае, Мінскае) аддзяленні, Мінскае гарадское аддзяленне і іншыя арганізацыйныя структуры, прадугледжаныя гэтым Статутам.

4.3. Аснову БСМД складаюць пярвічныя арганізацыі і (або) раённыя (гарадскія) арганізацыі (аддзяленні), якія ствараюцца па вытворчаму або прафесійнаму прынцыпу.

4.4. Пярвічныя арганізацыі ў творчых калектывах і ва ўстановах ствараюцца пры наяўнасці трох і болей членаў БСМД і зацвярджаюцца рашэннем прэзідыума Праўлення БСМД.

Рашэнне аб стварэнні раённай (гарадской) арганізацыі прымае сход ініцыятараў пры наяўнасці не менш як 10 чалавек, якое зацвярджаецца рашэннем прэзідыума Праўлення БСМД.

4.5. Вышэйшым органам пярвічнай, раённай (гарадской) арганізацыі з’яўляецца сход, які збіраецца 1 раз у 5 гадоў. Сход пярвічнай, раённай (гарадской) арганізацыі:

- вызначае накірунак дзейнасці арганізацыі;
- выбірае старшыню або, у залежнасці ад колькасці членаў арганізацыі, савет у складзе не менш трох чалавек;
- выбірае рэвізора;
- заслухоўвае штогодныя справаздачы старшыні і рэвізора і прымае па іх рашэнні;
- разглядае іншыя пытанні дзейнасці сваёй арганізацыі.

У перыяд паміж сходамі дзейнасцю пярвічнай, раённай (гарадской) арганізацыі кіруе старшыня (савет пад кіраўніцтвам старшыні).

Старшыня:

- арганізуе выкананне рашэнняў сходу;
- даводзіць да членаў сваёй арганізацыі рашэнні вышэйстаячых органаў БСМД;
- забяспечвае арганізацыю правядзення мерапрыемстваў БСМД у сваёй арганізацыі, раёне (горадзе).

Рэвізор:

- кантралюе і рэвізуе дзейнасць пярвічнай, раённай (гарадской) арганізацыі;
- правярае ўлік дакументаў і справаводства арганізацыі, законнасць і абгрунтаванасць адказаў на скаргі, лісты і заявы членаў БСМД;
- кантралюе выкананне палажэнняў гэтага Статута членамі і старшынёй пярвічнай, раённай (гарадской) арганізацыі.

4.6. Пярвічныя арганізацыі, з улікам іх дзейнасці і колькасці членаў БСМД, рашэннем прэзідыума Праўлення могуць набыць правы юрыдычнай асобы.

Пярвічныя, раённыя (гарадскія) арганізацыі могуць знаходзіцца у складзе абласнога (Мінскага гарадскога) аддзялення і ўзаемадзейнічаць непасрэдна з прэзідыумам Праўлення БСМД.

4.7. Абласныя (Мінскае гарадское) аддзяленні ствараюцца паводле рашэння Устаноўчай канферэнцыі членаў БСМД, якія пражываюць на тэрыторыі адпаведнай вобласці (г. Мінска).

Абласныя аддзяленні могуць мець на сваёй тэрыторыі структурныя падраздзяленні – пярвічныя, раённыя (гарадскія) арганізацыі, якія ствараюцца пры наяўнасці 10 чалавек членаў БСМД на адпаведнай тэрыторыі.

Вышэйшым органам абласнога (Мінскага гарадскога) аддзялення, у залежнасці ад колькасці членаў БСМД, з’яўляецца агульны сход або

канферэнцыя, якія праходзяць адзін раз у пяць гадоў. Пазачарговы сход аддзялення можа быць скліканы па ініцыятыве рэвізійнай камісіі (рэвізора) або не менш 1/3 пярвічных арганізацый аддзялення, альбо не менш 1/3 членаў аддзялення БСМД. Сход (канферэнцыя):

- вызначае накірунак дзейнасці абласнога (Мінскага гарадскога) аддзялення;
- выбірае Праўленне аддзялення;
- выбірае рэвізійную камісію (рэвізора);
- заслухоўвае і зацвярджае справаздачы аб дзейнасці Праўлення і Рэвізійнай каміісіі аддзялення, прымае па іх рашэнні;
- разглядае іншыя пытанні дзейнасці аддзялення.

Праўленне абласнога (Мінскага гарадскога) аддзялення:

- арганізуе выкананне рашэнняў агульнага сходу (канферэнцыі) аддзялення;
- распрацоўвае і зацвярджае планы работы аддзялення;
- арганізуе правядзенне мерапрыемстваў БСМД на тэрыторыі адпаведнай вобласці (г. Мінска);
- разглядае іншыя пытанні дзеянасці аддзялення.

Штодзённае кіраўніцтва абласным (Мінскім гарадскім) аддзяленнем ажыццяўляе старшыня Праўлення і яго намеснік, якія выбіраюцца членамі Праўлення з свайго складу.

Старшыня Праўлення абласнога (Мінскага гарадскога) аддзялення:

- кіруе дзейнасцю Праўлення;
- размяркоўвае абавязкі паміж членамі Праўлення;
- рэгулярна (не радзей аднаго разу ў год) дае Праўленню справаздачу аб сваёй рабоце.

Пасяджэнні Праўлення праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў 6 месяцаў.

Рэвізійная камісія (рэвізор):

- кантралюе і рэвізуе фінансава-гаспадарчую і статутную дзейнасць аддзялення;
- правярае ўлік дакументаў і арганізацыю справаводства аддзялення, законнасць і абгрунтаванасць адказаў на скаргі, лісты і заявы членаў БСМД;
- кантралюе выкананне палажэнняў гэтага Статута членамі БСМД і Праўленнем аддзялення.

4.8. Вышэйстаячыя выбарныя органы БСМД маюць права правяраць дзейнасць адпаведных ніжэйстаячых органаў БСМД. Рашэнні органаў яго арганізацыйных структур могуць быць абскарджаны ў вышэйстаячыя выбарныя органы.

Прэзідыум Праўлення БСМД мае права адмяніць рашэнні Праўлення абласнога (Мінскага гарадскога) аддзялення і агульнага сходу пярвічнай, раённай (гарадской) арганізацыі.

4.9. Паводле рашэння прэзідыума Праўлення БСМД абласныя (Мінскае гарадское) аддзяленні, а таксама пярвічныя арганізацыі, раённыя (гарадскія) аддзяленні могуць быць надзелены правамі юрыдычнай асобы. Іхняя рэгістрацыя ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь “Аб грамадскіх аб’яднаннях”. У гэтым выпадку старшыня Праўлення абласнога (Мінскага гарадскога) аддзялення, старшыня пярвічнай, раённай (гарадской) арганізацыі і яго намеснік:

- без даверанасці дзейнічаюць ад імя аддзялення БСМД, прадстаўляюць іх ва ўсіх органах улады і кіравання, прадпрыемствах і арганізацыях;
- заключаюць дагаворы ад імя БСМД, у тым ліку – працоўныя;
- выдаюць даверанасці;
- адкрываюць рахункі ў банку;

– распараджаюцца сродкамі БСМД, якія знаходзяцца ў аддзяленні, пярвічнай арганізацыі, падпісваюць дакументы, якія звязаны з фінансавымі аперацыямі і ажыццяўленнем вытворча-гаспадарчай дзейнасці, распараджэннем і набыццём маёмасці, каштоўных папераў.

Прэзідыум Праўлення БСМД мае права сваім рашэннем удакладняць і канкрэтызаваць паўнамоцтвы органаў кіравання структурных падраздзяленняў і іх кіраўнікоў.

4.10. Вышэйшым органам БСМД з'яўляецца з'езд, які склікаецца раз у пяць гадоў. Норма прадстаўніцтва, парадак дня з'езда, дата і месца правядзення вызначаюцца Праўленнем БСМД не пазней, чым за тры месяцы да яго адкрыцця. З'езд паўнамоцны пры наяўнасці не менш 2/3 абраных дэлегатаў. Рашэнне з'езда лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавалі не менш як 2/3 удзельнікаў.

4.11. Пазачарговы з'езд БСМД можа быць скліканы па рашэнні Праўлення, ініцыятыве 1/3 і больш пярвічных аганізацый, 1/3 і больш членаў БСМД або Рэвізійнай камісіі БСМД.

4.12. З'езд БСМД:

– абмяркоўвае і ацэньвае тэндэнцыі развіцця музычнага, харэаграфічнага і эстраднага мастацтва і вызначае асноўныя накірункі дзейнасці БСМД;
– зацвярджае назву і Статут БСМД;
– уносіць у Статут БСМД змяненні і (ці) дапаўненні;
– заслухоўвае і зацвярджае справаздачы аб дзейнасці Праўлення і Рэвізійнай камісіі БСМД;
– выбірае Праўленне і Рэвізійную камісію БСМД тэрмінам на пяць гадоў;
– разглядае іншыя пытанні статутнай дзейнасці БСМД;

Парадак і форма галасавання вызначаюцца з'ездам.

4.13. Кіруючым органам БСМД з’яўляецца Праўленне. Праўленне кіруе ўсёй дзейнасцю БСМД у перыяд паміж з’ездамі. Праўленне выбіраецца з дэлегатаў з’езда з абавязковым прадстаўніцтвам аддзяленняў.

4.14. Праўленне БСМД:

- вызначае формы і спосабы рэалізацыі рашэнняў з’езда;
- выбірае старшыню Праўлення і яго намеснікаў тэрмінам на пяць гадоў;
- выбірае прэзідыум Праўлення;
- уносіць змяненні і дапаўненні ў Статут БСМД, звязаныя з пераменай юрыдычнага адрасу аб’яднання, абумоўленыя змяненнямі ў заканадаўстве або па ўласнай ініцыятыве;
- вызначае памеры ўступных і членскіх узносаў;
- разглядае іншыя пытанні дзейнасці БСМД у межах сваей кампетэнцыі.

Парадак і форма галасавання вызначаюцца Пленумам.

Пленумы Праўлення праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў год.

4.15. Прэзідыум Праўлення з’яўляецца выканаўчым распарадчым органам БСМД і выбіраецца з членаў Праўлення. Старшыня Праўлення і яго намеснікі ўваходзяць у прэзідыум Праўлення па пасадзе.

4.16. Прэзідыум Праўлення БСМД:

- арганізуе выкананне рашэнняў з’езда і Праўлення БСМД;
- каардынуе дзейнасць аддзяленняў і пярвічных арганізацый;
- прадстаўляе інтарэсы БСМД у дзяржаўных і грамадскіх арганізацыях;
- зацвярджае гадавыя планы работы БСМД і справаздачы па іх;
- зацвярджае гадавы бюджэт БСМД і каштарыс расходаў;

- прымае рашэнні аб стварэнні і ліквідацыі аддзяленняў БСМД, прадпрыемстваў, малых і сумесных прадпрыемстваў, майстэрань, творчых калектываў і іншых гасразліковых арганізацый, зацвярджае іх палажэнні і кіраўнікоў;
- ажыццяўляе прыём у члены БСМД і прымае рашэнне аб выключэнні з членаў БСМД;
- зацвярджае рэдактара друкаванага органа;
- зацвярджае ўзоры пячаткі, членскага білета, сімволікі БСМД;
- арганізуе адзіную сістэму ўліку і справаздачнасці БСМД;
- зацвярджае і прызначае стыпендыі навучэнцам;
- зацвярджае штатны расклад апарата Праўлення;
- вызначае парадак дня і дату правядзення пленума Праўлення;
- вызначае памер адлічэнняў, узносаў пярвічных арганізацый і аддзяленняў, сваіх гасразліковых структур на рахунак БСМД;
- стварае секцыі, асацыяцыі, камісіі, іншыя грамадскія і творчыя фарміраванні;
- фарміруе бюро прэзідыума Праўлення БСМД;
- разглядае і ажыццяўляе іншыя пытанні дзейнасці БСМД, прадугледжаныя гэтым Статутам.

Пасяджэнні прэзідыума Праўлення праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей чым адзін раз у квартал. Рашэнні прымаюцца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў.

4.17. Бюро прэзідыума Праўлення – выканаўча-аператыўны орган БСМД. Бюро фарміруецца прэзідыумам Праўлення ў саставе старшыні Праўлення, яго намеснікаў і асобных членаў прэзідыума Праўлення.

4.18. Бюро прэзідыума Праўлення БСМД:

- ажыццяўляе кіраўніцтва бягучай дзейнасцю БСМД;
- забяспечвае рэалізацыю рашэнняў прэзідыума Праўлення;

- кіруе работай штатнага апарата работнікаў Праўлення БСМД;
- рыхтуе пасяджэнні прэзідыума Праўлення;
- разглядае пытанні матэрыяльнай дапамогі і ўзнагароджвання членаў БСМД;
- разглядае іншыя пытанні Статутнай дзейнасці БСМД.

Пасяджэнні бюро праводзяцца па меры неабходнасці.

4.19. Штодзённае кіраўніцтва БСМД ажыццяўляюць старшыня Праўлення і яго намеснікі. Старшыня Праўлення або і адзін з яго намеснікаў БСМД падпісвае дакументы, звязаныя з фінансавымі аперацыямі, распараджаецца набыццём маёмасці, каштоўных папераў.

4.20. Кантрольны орган БСМД – Рэвізійная камісія – выбіраецца з’ездам.

4.21. Рэвізійная камісія са свойго саставу выбірае старшыню, намесніка старшыні і сакратара камісіі.

4.22. Рэвізійная камісія БСМД:

- кантралюе і рэвізуе выкананне палажэнняў Статута і рашэнняў з’езда выбарнымі органамі БСМД і яго аддзяленнямі;
- кантралюе фінансава-гаспадарчую дзейнасць апарата Праўлення БСМД і ствараемых ім аддзяленняў, прадпрыемстваў;
- кантралюе тэрміны праходжання дакументаў у органах БСМД;
- правярае арганізацыю справаводства, тэрміны, законнасць і абгрунтаванасць адказаў на скаргі, лісты і заявы членаў БСМД;
- аказвае метадычную дапамогу рэвізійным камісіям структур БСМД.

4.23. Члены Рэвізійнай камісіі не могуць быць выбранымі ў другія выбарныя органы, займаць пасады кіраўнікоў і галоўных спецыялістаў яго вытворча-гаспадарчых структур. Яны могуць прымаць удзел у рабоце выбарных органаў з правам дарадчага голасу.

4.24. Усе рашэнні калегіяльных органаў афармляюцца пратаколамі.

## 5. ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ, МАЁМАСЦЬ І СРОДКІ БСМД.

5.6. БСМД для выканання мэт і задач можа:

- мець ва ўласнасці любую маёмасць, неабходную для матэрыяльнага забеспячэння дзейнасці, прадугледжанай Статутам, у тым ліку: будынкі, збудаванні, жыллёвы фонд, абсталяванне, інвентар, музычныя інструменты і прыналежнасці, грашовыя сродкі ў рублях і валюце іншых дзяржаў, прадпрыемствы, фірмы і іншыя гасразліковыя фарміраванні, а таксама ў парадку, вызначаным дзяржавай, акцыі і іншыя каштоўныя паперы;
- ажыццяўляць прамыя міжнародныя кантакты і сувязі, удзельнічаць у стварэнні сумесных прадпрыемстваў, заключаць адпаведныя пагадненні і рабіць іншыя захады, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь і яе міжнародным абавязацельствам;
- займацца выдавецкай дзейнасцю і мець свой друкаваны орган;
- удзельнічаць у фарміраванні розных фондаў салідарнасці, падтрымкі, абароны, якія адпавядаюць культурна-асветнаму прызначэнню і статутным мэтам і задачам;
- ствараць прадпрыемствы, малыя прадпрыемствы, майстэрні, творчыя калектывы, кансультацыйныя пункты і іншыя дзяржразліковыя арганізацыі.

5.7. Маёмасць і грашовыя сродкі БСМД фарміруюцца з:

- уступных і членскіх узносаў;
- адлічэнняў структурных падраздзяленняў;
- ахвяраванняў і дароў арганізацый, фірм, грамадзян Рэспублікі Беларусь і іншых краін;

- даходаў і паступленняў ад выдавецкай, гастрольна-канцэртнай і кансультацыйнай дзейнасці, ад рамонту і вырабу музычных інструментаў, ад створаных прадпрыемстваў, фірм, творчых калектываў, іншых дзяржразліковых структур;
- прыбыткаў ад вытворча-гаспадарчай і прадпрымальніцкай дзейнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі Закона Рэспублікі Беларусь “Аб грамадскіх аб’яднаннях”;
- паступленняў ад арганізацыі лекцый, выстаў, культурна-масавых, спартыўных і іншых, дазволеных заканадаўствам, мерапрыемстваў;
- іншых, не забароненых заканадаўствам паступленняў.

5.8. Уласнікам маёмасці БСМД, у тым ліку маёмасці, якая знаходзіцца ў яго арганізацыйных структур і прадпрыемстваў, з’яўляецца БСМД. Арганізацыйныя структуры і прадпрыемствы БСМД маюць права распараджацца маёмасцю і грашовымі сродкамі ў межах, якія вызначае гэты Статут.

5.9. БСМД і яго структуры, якія надзелены правамі юрыдычных асобаў, могуць у парадку, які вызначаецца заканадаўствам, заключаць пагадненні з дзяржаўнымі прадпрыемствамі, арганізацыямі і ўстановамі, фірмамі, кааператывамі, грамадскімі арганізацыямі і грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, іншых краін для выканання статутных мэтаў і задач.

5.10. БСМД не нясе адказнасці за даўгі сваіх структур і членаў, гэтак жа, як структуры і члены БСМД не нясуць адказнасці па яго даўгах.

5.11. Сродкі і маёмасць не могуць пераразмяркоўвацца паміж членамі БСМД.

# 6. ПАРАДАК СПЫНЕННЯ ДЗЕЙНАСЦІ БСМД.

6.1. Спыненне дзейнасці БСМД здзяйсняецца праз рэарганізацыю або ліквідацыю ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

6.2. Рэарганізацыя БСМД можа быць здзейснена паводле рашэння з’езда, за якое прагаласавалі 2/3 дэлегатаў – членаў БСМД, якія прысутнічалі на з’ездзе.

6.3. БСМД можа быць ліквідаваны:

- па рашэнні з’езда, за якое прагаласавалі 2/3 дэлегатаў – членаў БСМД, якія прысутнічалі на з’ездзе;
- паводле рашэння суда у выпадках і ў парадку, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам.

6.4. Ліквідацыя БСМД праводзіцца ліквідацыйнай камісіяй, створанай з’ездам. У сваёй дзейнасці ліквідацыйная камісія кіруецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

6.5. У выпадку ліквідацыі БСМД, маёмасць і грашовыя сродкі БСМД накіроўваюцца на пагашэнне даўгавых абавязацельстваў у парадку, прадугледжаным дзеючым заканадаўствам. Маёмасць, якая застаецца пасля пагашэння даўгоў, паводле рашэння ліквідацыйнай камісіі перадаецца для выкарыстання на статутныя мэты БСМД.

6.6. Дзейнасць структурнага падраздзялення БСМД спыняецца паводле рашэння прэзідыума Праўлення БСМД або ліквідацыі БСМД паводле рашэння суда.

6.7. Маёмасць і фінансавыя сродкі (калі яны былі ў распараджэнні структурнага падраздзялення), пасля задавальнення ўсіх патрабаванняў крэдытораў, перадаюцца ў распараджэнне Праўлення БСМД.

6.8. Дакументы здаюцца ва ўстановы Дзяржаўнага архіву па месцы знаходжання юрыдычнага адрасу.